УДК 93/94

# РАЗМЕЖАВАННЕ ЎЧАСТКА ЎЛАДАННЯЎ ШКЛОЎСКАЙ І БЫХАЎСКАЙ ВАЛАСЦЕЙ 1541 г.

**Прасаловіч А. В.**
(г. Магілёў, Беларусь)

Анатацыя. У дакладзе разгледжана камісарскае размежаванне 1541 г., абумоўленае зямельным канфліктам паміж сялянамі в. Алейня (цяпер – Алень) у складзе Шклоўскай воласці Ст. Гаштольда, ды сёл Чарчэвічы (цяпер – Гарадзішча) і Сялец (цяпер – Балонаў-Сялец), што належалі да Быхаўскай воласці, дзяржаўцам якой быў А. Хадкевіч.

Ключавыя словы: Быхаў, Шклоў, Хадкевічы, Гаштольды, камісарскі суд, размежаванне.

Summary. The report addresses the issue of commissar demarcation in 1541. It was caused by a land conflict between peasants from the village of Aleinia (now – Olen) in the Shklovsky volost Gashtold and the villages of Charchevichi (now – Gorodishche) and Selets (now – Bolonov-Selets), which belonged to Bykhov volost, owned by A. Hadkevich.

Keywords: Bykhov, Shklov, Hadkevichi, Gastoldy, commissar court, demarcation

У сярэдзіне XV ст. амаль уся сучасная Быхаўшчына з усходняй часткай Кіраўшчыны разам з іншымі маёнткамі была перададзеныя нашчадкам друцкіх князёў, спрадвечных уладароў таго краю, князем Міткам Сямёнавічам Друцкім-Зубравіцкім па мянушцы Сякіра ў спадчыну сваёй жонцы Сафіі і сваім дзецям. Гэта адбылося ў перыяд паміж 1444 г. і 1459 г. У 1495 г. дачка Сякіры Марына Міткаўна, удава князя Сямёна Трабскага, перадала тыя абшары (у тым ліку Быхаўшчыну, Шклоўшчыну і частку Магілёўскага раёна) свайму ўнуку, будучаму віленскаму ваяводу Гаштольду Альбрыхту Марцінавічу [1, с. 169], які на пачатку XVI ст. з'яўляўся найзаможнейшым магнатам Вялікага Княства Літоўскага (напрыклад, згодна з Попісам літоўскага войска 1528 г. ён выстаўляў 466 конных ваяроў) [3, с. 500]. На той час Новы Быхаў яшчэ не згадваецца, цэнтрам маёнтка быў суседні Тайманаў (сучасная вёска Тайманава Быхаўскага раёна). Пасля смерці Альбрыхта ягоная спадчына перайшла адзінаму сыну – навагрудскаму, а пазней троцкаму ваяводзе Станіславу.

Яшчэ адным заблытаным пытаннем з'яўляецца наяўнасць двух Быхаўскіх маёнткаў, адзін з якіх з цэнтрам у Тайманаве – умоўна кажучы, сучасны Новы Быхаў, а пазнейшае Навабыхаўскае графства – належаў Гаштольдам, а другі – цяпер проста Быхаў, а раней – Стары Быхаў, на 1541 г. з'яўляўся вялікакняскай уласнасцю, што знаходзілася ў дзяржанні (трыманні) у берасцейскага старосты, вількійскага, астрынскага і кнышынскага дзяржаўцы Хадкевіча Аляксандра Іванавіча [1, с. 170].

Старабыхаўская воласць ахоплівала паўночна-заходнюю частку сучаснага Быхаўскага раёна з прылеглымі тэрыторыямі ўсходняй Клічаўшчыны і паўднёва-заходняй Магілёўшчыны.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Разгляданы намі дакумент захаваўся ў якасці пазнейшай копіі XVIII ст. у складзе Архіва Радзівілаў [2, с. 1]. Гаворка ідзе пра камісарскі дэкрэт ад 28 кастрычніка 1541 г. Камісарскімі судамі ў Вялікім Княстве Літоўскім зваліся часовыя суды, што фармаваліся дзеля разгляду зямельных прэтэнзій прыватных землеўласнікаў, манастыроў, гарадоў ды дзяржаўцаў вялікакняскіх маёнткаў. Суддзямі ў іх выступалі камісары, што прызначаліся вялікім князем (каралём). Судовая справа разглядалася на месцы з выклікам бакоў і сведкаў, аглядам межаў маёнткаў. Камісарскі суд вызначаў межы зямельных уладанняў і пазначаў іх на мясцовасці капцамі, якія насыпаліся над вуголлем, бітым шклом і г. д., "рубяжамі" (знакамі на адметных дрэвах), клейнамі (шляхецкімі знакамі). У выніку разгляду справы складаўся судовы акт – камісарскі дэкрэт [4, с. 46].

У нашым выпадку ў якасці камісараў выступілі дзяржаўца Магілёўскай вялікакняскай воласці Тодар Мацвеевіч Бака і троцкі падключнік Васіль Канстанцінавіч Жаба, якія мусілі вырашыць памежны і маёмасны канфлікт паміж падданымі Аляксандра Хадкевіча, сялянамі сяла Чарчэвічы ("чарчаўлянамі"), з аднаго боку, і Гаштольдавымі сялянамі з вёскі Алень ("алянчанамі"), з другога [7, с. 3]. Бакі, дамовіўшыся разгледзець пытанне на дзень Святых Сымона і Юды, выбралі сваіх камісараў: навагародскі ваявода выбраў сабе гаспадарскіх зямян Багдана Яцкавіча Юрагу, свайго быхаўскага намесніка, і Сямёна Мацкевіча, а пан маршалак узяў сабе за камісараў згаданых вышэй Баку і Жабу.

За два дні да прызначанага тэрміну камісары прыехалі ў Чарчэвічы, дзе Хадкевічаў ураднік Кміта Радзівонавіч пералічыў найбольшыя крыўды, што цярпеліся ад алянчан: захоп земляў, наезды, гвалты, бойкі, рабункі, забароны на праезд па дарогах, недапушчэнне ў азёры і ў бортныя дрэвы, скажэнне межаў, зжынанне хлебу і г.д. Ураднікі абодвух бакоў – Юрага і Кміта – абмяняліся лістамі і прызначылі найбліжэйшую суботу і Быхаў як час і месца фармавання палюбоўнай камісіі. Тады ж, у суботу, камісары, сабраўшыся ў Быхаве, прапанавалі спачатку выслухаць прэтэнзіі абодвух бакоў. Хадкевічаў Кміта распавёў падрабязней пра крыўды, што трываюць чарчаўляне і сяльчане, а Юрага на пытанне пра скаргі збоку аленчан адказаў, што Алень, хоць і належыць пану навагародскаму ваяводзе, Гаштольду, але адносіцца не да ягонай, Быхаўскай, але да Шклоўскай воласці, і прапанаваў звярнуцца наконт чынёных аленчанам крыўдаў да Міхала Тышкевіча, шклоўскага ўрадніка Станіслава Гаштольда. З улікам няяўкі Тышкевіча суддзі паклікалі сведак – гаспадарскіх, г. зн. вялікакняскіх сялян з сяла Чарчэвічы Юду Міхневіча, Дзяніса Арцімовіча, Сяргея Фядковіча, якія распавялі, што бачылі, як аленскі ўраднік Філіп Няшыйка з натоўпам пабілі чарчаўлян на іхным уласным возеры, пастралялі і паранілі, адабралі невады з вазамі і коньмі ды рыбу ў возеры палавілі. Пасля свайго распаведу падданыя пана Хадкевіча прысягнулі ў сваёй праўдзе з укленчаннем. У выніку вінаватымі былі прызнаны падданыя Шклоўскай воласці.

Пазней, дазнаўшыся пра тое, што ад жыхароў Алені крыўды церпяць яшчэ і сяляне сяла Сялец на ўсходнім беразе ракі Друць, трохкротна пасылалі па суддзяў і ўраднікаў Гаштольда, а на чацвёрты раз за імі ездзіў сам пан Кміта. Высветлілася, што аленчане, пераходзячы мяжу, забіралі сабе пушчы, лясы, палі, сенажаці, бортныя дрэвы з пчоламі, пасказілі адвечныя граніцы, павысякалі і папалілі рубежныя дрэвы. З прадстаўнікамі навагародскага ваяводы былі прызначаны месца і час разгляду справы і заключэння дамовы, высвятлення: чые рубежныя знакі старэйшыя і слушнейшыя, а сведкі – годнейшыя, па тых граніцах найперш і паехалі б паводле таго, якія патрабаванні да апісання на камісіях прапісаны ў Гаспадарскім земскім статуце.

Прадстаўнікоў боку пана Гаштольда чакалі на ўмоўленым месцы ад самага ранку да вечара, але яны так і не з'явіліся. Тады камісары вырашылі кіравацца старым звычаем і выставіць сведкаў, каб абазначыць граніцу паміж Шклоўскай воласцю Гаштольда і гаспадарскай Быхаўскай воласцю. Хадкевічаў ураднік Кміта паставіў перад імі староннiх гаспадарскіх людзей з сяла Іструбішчы (у тэксце – Выструбішчы, цяпер – Батунь Магілёўскага раёна) і іншых вялікакняскіх вёсак: Навума і Грытка Антановічаў, Градзьму Галяневіча, Ерамея Фядковіча, Радзівона Вашчынку, Гаўрылу Савасьцяновіча, Антона Малевіча, Барыса Левановіча, Лешка Красніковіча [5, с. 17]. Любашанскай воласці (якая займала вялікую частку цяперашніх Клічаўскага і Бялыніцкага раёнаў Магілёўскай ды Бярэзінскага раёна Мінскай абласцей) – гаспадарскіх мужоў Юду Мяцясовіча, Андрэя Шорава, Саву Данісевіча, Данілу Арцямовіча, Андрэя Галеніча, Назара Зянковіча, Ларку Бародзіча, Астапа Сымановіча, а таксама іншых гаспадарскіх людзей агульным лікам 32 чалавек [4, с. 411].

Гэтыя сведкі павялі членаў камісіі, указваючы адвечныя межы паміж сялецкімі і аленскімі землямі: "Найперш павялі нас уверх па рацэ Дзедні ў Сасновае балота, а ад Сасновага балота луга – у Трасцяніцу, а ад Трасцяніцы мяжой у Купела, а ад Купела – да раскідзістага дуба, на якім з абодвух бакоў ёсць старыя межавыя знакі, а ад дуба ўпярак ракі Балоневы (цяперашняя Балонаўка, левы прыток Друці ў Быхаўскім раёне), а ад Балонаўкі – да старой Гасцішэўскай дарогі, а ад той дарогі – падышоўшы трохі да кляновага пня, дзе быў стары межавы знак, а ад пня – да ручая Кучын (адсюль назва сучаснай вёскі Кучын Быхаўскага раёна), дзе пачалася мяжа паміж землямі Глухскага сяла (цяперашнія Глухі Быхаўскага раёна) пана Аляксандра і землямі гаспадарскіх людзей з Дасовіч у Магілёўскай воласці (цяпер – у Магілёўскім раёне), пры гэтым землі аленскіх людзей пана Гаштольда засталіся па левай старане, а зямля сялецкіх людзей пана Аляксандра – па правай старане" [2, с. 2]. Скончыўшы абвод, 18 сведкаў сталі, паводле звычаю, на ўзвышэнне і прысягнулі сваімі душамі ў правільнасці паказаных імі межаў: прысяга была патрэбная з таго, што бок пана навагародскага ваяводы не выставіў, як таго патрабаваў Земскі статут, сваіх 8 сведкаў.

У выніку вінаватымі былі ізноў прызнаныя Гаштольдаў ураднік Філіп Няшыйка і алянчане: за гвалтоўнае вылоўліванне рыбы, збіццё і раненне чарчаўлян, а што тычыць межаў паміж Аленню і Сяльцом, то камісія, улічваючы ўсе сведчанні, па старых знаках праклала новыя межы. Сведкамі сталіся гаспадарскі зямянін Магілёўскага павета пан Гаўрыла Кананові, цяцерынскі баярын пан Міцька Рэпін-Стоцкі, Яе Міласці Каралевы рагачоўскі зямянін пан Юран Міхалоўскі, прапойскі ўраднік князя Івана Вішнявецкага гаспадарскі зямянін Брэсцкага павета пан Сасім, Міхал Паўлавіч Бышэўскі, слуга рагачоўскага ўрадніка пана Паўла Папяльжыцкага, і пінскі баярын Яе Міласці Каралевы Баран. Пасля гэтага пану Аляксандру Хадкевічу быў выдадзены напісаны ў Быхаве судовы ліст, змацаванымі камісарскімі пячаткамі і датаваны 28 кастрычніка 1541 г. (15-га індыкта).

Гэтая справа – прадмет дадзенага даклада – паказвае, папершае, наколькі адрознымі былі тагачасныя межы ўладанняў на тэрыторыі сучаснае Магілёўшчыны: як бачым, мяжа паміж Шклоўскай і Быхаўскай валасцямі праходзіла ля сярэдняга цячэння Друці, нейкім чынам абыходзячы Магілёўскую. Па-другое, яна адлюстроўвае складанае становішча сялян, якія праз недахоп рэсурсаў мусілі канкураваць за зямлю на пачатковым этапе канчатковага феадальнага запрыгоньвання. Па-трэцяе, у ёй апісваюцца цікавыя аспекты звычаёвага права, якое ўжывалася пры вырашэнні канфліктаў нават у рамках афіцыйнага разгляду справы камісарамі магнатаў. І найгалоўнейшае: гэты дакумент утрымлівае ці не найстарэйшае ў нашым краі апісанне тапаграфічнае працы камісараў, якія адказвалі за як мага больш дакладнае размежаванне маёнткаў дзеля таго, каб пазбегнуць зямельных і маёмасных канфліктаў у будучыні.

**Літаратура:**


1. Волкаў, М. Быхаў у першай палове XVII ст. // Сапегі: асобы, кар'еры, маёнткі : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А.А. Скеп'ян ; рэдкал. А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : А.М. Янушкевіч, 2018. – 320 с. : іл.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 694. Воп. 7. Спр. 832.
3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 2 / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – 537 с.: іл.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 4 / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1997. – 432 с.: іл.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : 6 т. Т. 5 / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн, 1999. – 592 с.: іл.
6. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (LVIA). – F. 525. Ap. 8. B. 41
7. LVIA. – F. 1282. Ap. 5. B. 139




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова